1. *Волков, В. А.* Архитектоника современного медиапространства / В. А. Волков // Вес. Ин-та современ. знаний. – 2016. – № 3. – С. 65–69.

2. *Кириллова, Н. Б.* Медиакультура: от модерна к постмодерну / Н. Б. Кириллова. – М. : Академпроект, 2006. – 448 с.

3. *Короченский, А. П.* Медиакритика в теории и практике журналистики : автореф. дис. … д-ра фил. наук : 10.01.10 / А. П. Короченский ; СПбГУ. – СПб., 2003. – 41 с.

4. *Красовская, Е. В.* Жанровое своеобразие публикаций на тему инноваций в белорусской региональной прессе / Е. В. Красовская // Вестн. МГЛУ. – 2017. – № 4. – С. 37–42.

5. *Красовская, Е. В.* Информационное общество Республики Беларусь / Е. В. Красовская, В. М. Литвинович. – Минск : ИАЦ, 2014. – 84 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***С. В. Гаўрылава,*** *аспірант, кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*загадчык філіяла Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка*

# МУЗЕЙ У ФАРМІРАВАННІ САМАСВЯДОМАСЦІ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ НОВАЙ ЭКСПАЗІЦЫІ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ ПОЛАЦКА)

Агульна прызнана, што музей мае шырокія магчымасці ў фарміраванні нацыянальнай, грамадзянскай, гістарычнай самасвядомасці наведвальнікаў. Рэалізуючы свае сацыяльныя функцыі, музей з'яўляецца медыятарам у камунікацыі паміж пакаленнямі, у перадачы гістарычнага вопыту. Першынство ў гэтым працэсе належыць рэгіянальным музеям, якія ўяўляюць даміанты сацыякультурнай дзейнасці ў рэгіёнах. Адным з інструментаў, што выкарыстоўваюць музеі ў фарміраванні самасвядомасці мясцовага насельніцтва, з'яўляецца музейная экспазіцыя.

Вялікі патэнцыял у ажыццяўленні культурна-адукацыйнай працы краязнаўчых музеяў маюць экспазіцыі, пабудаваныя на аснове прынцыпу антрапацэнтрызму, у якіх рэгіянальная гісторыя інтэрпрэтуецца праз лёс канкрэтнага чалавека. Суадносіны агульнага і прыватнага, а таксама ўвага да індывідуальнасці (так званая «персонификация местной истории» [2, с. 229]), з’яўляецца асновай стварэння

запатрабаванай мясцовым грамадствам экспазіцыі. Пра важнасць такога падыходу ў паказе гісторыі адзначалі ў сваіх артыкулах, да прыкладу, расійскія гісторыкі і музеязнаўцы М. Е. Каўлен і І. В. Чувілава: «Возникающая при этом коммуникация, субъектами которой являются две личности – человек иного исторического времени и современный посетитель – в значительной степени меняет характер восприятия экспозиции» [3, с. 219]. «Это чувство узнавания, самоидентификации, фиксирование себя в определенной точке пространственно-временного континуума очень важно сегодня для установления полноценной коммуникации… В значительной мере это узнавание происходит благодаря показу локальной истории через личность, когда далекие и малопонятные события обретают подлинные лица и голоса» [4, с. 30–31].

У снежні 2016 г. у Краязнаўчым музеі Полацка адкрылася стацыянарная выстава «Ганаровыя грамадзяне горада Полацка», прымеркаваная да 50-годдзя ўстанаўлення звання «Ганаровы грамадзянін горада Полацка». Мэтай стварэння выставы было прадставіць жыццё і дзейнасць людзей, якія ўдастоены звання Ганаровы грамадзянін, у падзейным кантэксце мясцовай гісторыі 2-й паловы XX – пачатку XXI ст. Акрамя таго, выстава вырашыла задачу арганізацыі на базе музея пляцоўкі для сустрэчы прадстаўнікоў розных пакаленняў, правядзення мерапрыемстваў, папаўнення фондаў матэрыяламі аб пасляваенным і сучасным развіцці горада.

У структуры экспазіцыі былі выдзелены чатыры раздзелы. Першы з іх – «Званне “Ганаровы грамадзянін горада Полацка”» – прысвечаны паказу гісторыі з’яўлення звання «Ганаровы грамадзянін горада Полацка» ў 1967 г. і працягу традыцыі ўшанавання асобных палачан за іх выдатныя заслугі перад горадам з 2003 г.

У другім раздзеле – «З фронту ваеннага на фронт працоўны» – прадстаўлены матэрыялы пра першых узнагароджаных – людзей розных прафесій, што змагаліся за вызваленне Радзімы ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны (і Полацка ў прыватнасці), удзельнічалі ў пасляваенным аднаўленні горада, наладжванні мірнага жыцця, вялі актыўную грамадскую працу і ўнеслі ўклад у «справу камуністычнага выхавання моладзі».

Трэці раздзел – «На шляху вялікіх здзяйсненняў» – аб’яднаў асоб, якія атрымалі ганаровае званне ў мірны час, калі Полацк



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ператварыўся ў буйны прамысловы цэнтр. Гэта людзі, занятыя ў розных сферах, – чыгуначнікі, ткачыхі, медыкі, настаўнікі, пісьменнікі і інш.

Матэрыялы апошняга раздзела экспазіцыі – «Адраджэнне памяці – абуджэнне душы», апавядаюць пра палачан, якія атрымалі званне ў перыяд незалежнай Беларусі, сталі прыкладам новага стаўлення да ролі чалавека ў жыцці горада. Ганаровыя грамадзяне XXI ст. працавалі на ніве захавання гісторыка-культурнай спадчыны Полацка, адраджэння духоўнасці палачан.

Экспазіцыя стацыянарнай выставы «Ганаровыя грамадзяне горада Полацка» арганічна звязана з усёй экспазіцыяй музея і з'яўляецца яе працягам, што пашырае часавыя межы рэпрэзентацыі гісторыі Полацка да 2016 г. Кожны музейны прадмет, які экспануецца на выставе, мае вялікі інфармацыйны патэнцыял, у сувязі з чым здольны рэпрэзентаваць не толькі асобу, але і мадэляваць гістарычны кантэкст: асабістыя дакументы і ўзнагароды, прадметы побыту, друкаваныя выданні і г. д. Інфармацыйнае поле экспазіцыі пашыраюць невялікія па працягласці відэафільмы, запісы інтэрв'ю, фатаграфіі і іншыя матэрыялы, што знаходзяцца ў фондах і не ўвайшлі ў экспазіцыю, якія ў электронным выглядзе прадстаўлены ў інфармацыйным тэрмінале. Напаўненне тэрмінала паступова папаўняецца. Для правядзення мерапрыемстваў у выставачнай зале ўсталяваны экран і відэапраектар, выдзелена прастора для размяшчэння аўдыторыі.

За мінулыя 9 месяцаў з моманту адкрыцця выставы яе наведала амаль 7 тыс. чалавек, праведзена 23 мерапрыемствы [1], устаноўлены сувязі з роднымі і сябрамі Ганаровых грамадзян горада Полацка (у першую чаргу тых, якія ўжо пайшлі з жыцця), фонды Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, філіялам якога з'яўляецца Краязнаўчы музей, папоўніліся музейнымі прадметамі (не лічачы тых, што былі прыняты ў фонды на этапе падрыхтоўкі экспазіцыі) з асабістых калекцый васьмі Ганаровых грамадзян.

На наш погляд, экспазіцыя стацыянарнай выставы «Ганаровыя грамадзяне горада Полацка» вырашыла ўсе пастаўленыя пры яе стварэнні задачы: знаёміць наведвальніка з гісторыяй Полацка 2-й паловы XX – пачатку XXI ст., асобамі, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё горада азначанага перыяду; а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляецца пляцоўкай для дыялогу пакаленняў, актуалізацыі і трансляцыі індывідуальнага і калектыўнага вопыту. Камунікацыя, якая ўзнікае паміж «героямі» экспазіцыі і наведвальнікамі, набывае асаблівую эмацыйнасць, што ўплывае на індывідуальны свет яе ўдзельнікаў, а іх узаемадзеянне з рэаліямі аб'ектыўнага свету – музейнымі прадметамі – стварае ўмовы для фарміравання самасвядомасці палачан.


*1.* Бягучы архіў Краязнаўчага музея Полацка.

*2. Кандаурова, Т. Н.* К вопросу о проблемах построения исторических экспозиций / Т. Н. Кандаурова // Современная историография и проблемы содержания исторических экспозиций музеев. По материалам «круглого стола», состоявшегося 18 мая 2001 г. в г. Орле / редкол.: В. Л. Егоров [и др.]. – М., 2002. – С. 227–233.

*3. Каулен, М. Е.* Проблема личности в исторической экспозиции / М. Е. Каулен // Современная историография и проблемы содержания исторических экспозиций музеев. По материалам «круглого стола», состоявшегося 18 мая 2001 г. в г. Орле / редкол.: В. Л. Егоров [и др.]. – М., 2002. – С. 219–226.

*4. Чувилова, И. В.* Местный музей как ключевой элемент развития идентичности / И. В. Чувилова // Новации в музейном мире. На пути к музею локальной истории нового типа : сб. науч. ст. / отв. ред. И. В. Чувилова, О. Н. Шелегина. – Новосибирск, 2017. – С. 24–52.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***В. М. Глубоченко,***
*кандидат педагогических наук, доцент,*
*профессор кафедры культурологии*
*и психолого-педагогических дисциплин*
*Института повышения квалификации*
*и переподготовки кадров*
*Белорусского государственного*
*университета культуры и искусств*


# ЦИФРОВОЙ БАЯН В СОВРЕМЕННОМ КУЛЬТУРНО-ОБРАЗОВАТЕЛЬНОМ ПРОСТРАНСТВЕ

Многообразие компьютерных технологий, виртуальных инструментов и цифровых устройств захлестнуло современный мир, стремительно ворвавшись во все сферы человеческой жизнедеятельности. В музыкальной культуре, как и в образовании, интерес к цифровым технологиям с каждым годом воз-